# Нацыяналцы-100! Топ цікавых фактаў пра Нацыянальную бібліятэку Беларусі

---

- 15.09.2022 11:06

**Сёння Нацыянальная бібліятэка Беларусі адзначае векавы юбілей. У такі памятны дзень Міністэрства культуры прыводзіць топ цікавых фактаў пра НББ. Там ёсць чым здзівіць і чаму здзіўляцца.**

---

1. Нацыянальная бібліятэка з'яўляецца адной з самых вялікіх у свеце: агульная плошча будынка — 113 669 кв. м; агульная вага — 140 000 тон. Будынак бібліятэкі удвая цяжэй Астанкінскай тэлевежы ў Маскве.

2. Галоўны ўваход у бібліятэку выкананы ў выглядзе старонак раскрытай кнігі. Будынак у форме каштоўнага каменя задуманы не выпадкова: алмаз, дыямент, а яшчэ дакладней — ромбакубаактаэдр сімвалізуе духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці, якія захоўваюцца ў бібліятэцы. З-за незвычайнасці канструкцыі Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўваходзіць у ТОП-50 самых «незвычайных будынкаў свету» і займае 24-е месца.

3. Ля будынка незвычайнае падсвятленне: вонкавае электроннае светлавое табло — адно з самых вялікіх рэкламных носьбітаў у Беларусі (плошча 1440 кв.м). Не было ні дня, калі б падсвятленне не ўключалася.

4. Грані ромбакубаактаэдра пакрытыя сеткай з 4,5 тысяч святлодыёдных лямпаў і могуць свяціцца больш чым 16 тысячамі адценняў. У начны час Нацыянальную бібліятэку відаць з космасу.

5. На пачатак 2022 года колькасць карыстальнікаў бібліятэкі перавысіла 200 тыс. Ва ўстанове камфортныя ўмовы створаны для ўсіх чытачоў. Для слабавідушчых і невідушчых карыстальнікаў працоўныя месцы аснашчаны спецыяльным абсталяваннем. Некаторыя паслугі можна атрымаць у аддаленым рэжыме.

І гэта яшчэ не ўсё. На працягу дня Мінкульт абяцае публікаваць цікавыя факты, якімі, дакладна, можна здзівіць.